# У Вільні часоў Скарыны

**Літоўцы нядаўна падлічылі, што галоўнымі гасцямі іх сталіцы з'яўляемся мы, жыхары Беларусі. У Вільнюс нашых суайчыннікаў прыводзяць самыя розныя мэты. Нямала сярод іх знаходзіцца і тых, хто выпраўляецца ў гэты горад дзеля знаёмства з... беларускай мінуўшчынай.**
**Так, у гісторыі Вільнюса, а найперш сярэдневяковай і даваеннай Вільні, маецца шмат яркіх фактаў і падзей, якія ў свой час прадвызначалі сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё беларускіх зямель.**
**Сярод тых, хто на пачатку XVI стагоддзя «каваў і гартаваў» у Вільні нашу нацыянальную справу, быў і ўсходнеславянскі першадрукар, беларускі асветнік-гуманіст, перакладчык, пісьменнік, грамадскі дзеяч, вучоны-медык і прадпрымальнік Францыск Скарына. Таму, каб больш дэталёва даведацца пра яго жыццё і дзейнасць у колішняй сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, мы накіраваліся ў сталіцу сучаснай Літоўскай Рэспублікі.**

Калі канкрэтна беларускі асветнік упершыню трапіў у Вільню? Скарыназнаўцы наконт гэтага выказваюць розныя меркаванні, з некаторымі з іх можна і пагадзіцца. Вядома, што бацька будучага першадрукара Лука Скарына быў заможным купцом, які займаўся гандлем скурамі і вырабамі з футра. Напрыклад, ён даволі паспяхова гандляваў з Масковіяй, пастаўляў свой тавар па Дзвіне ў Рыгу, меў склад у Познані. Зразумела, што пры такім шырокім дыяпазоне сваёй дзейнасці, ён аніяк не мог абмінуць Вільню, сталіцу тагачаснай магутнай еўрапейскай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага. Як сведчаць гістарычныя крыніцы, Лука Скарына меў там уласны гандлёвы склад, які, па ўсім відаць, не мог не карыстацца поспехам у мясцовых кушнераў і віленскіх модніц.

Цалкам заканамерна, што ў частыя паездкі з Полацка ў сталіцу бацька браў з сабой свайго ўлюбёнца, меншага сына Францыска. Калі прытрымлівацца гэтай гіпотэзы, то Вільня ўпершыню ўвайшла ў жыццё малога Францішка, які, як прынята лічыць, нарадзіўся паміж 1485 і 1490 гадамі, ужо недзе ў сярэдзіне 1490-х гадоў.

Мог пазнаёміцца са сталіцай ён і крыху пазней, прыкладна каля 1500 года. Відавочна, што без падрыхтоўкі і належных ведаў Ф. Скарына не здолеў бы ў 1504 годзе паступіць у Кракаўскі ўніверсітэт. Праўда, тут маглі адыграць сваю ролю грошы бацькі, але гэта – яўна не той выпадак. У галоўную на той час ВНУ Польшчы прымалі адукаваных, з шырокім кругаглядам і абавязковым веданнем лацінскай мовы юнакоў. Універсітэты не бралі са студэнтаў плату за навучанне. У некаторых выпадках трэба было ўнесці толькі невялікі ўступны ўзнос: напрыклад, Ф. Скарына заплаціў у скарбонку Кракаўскага ўніверсітэта тры літоўскія грошы. Аднак здымаць жыллё і харчавацца студэнтам трэба было за ўласны кошт. А гэта было не танна, але сям'я будучага беларускага першадрукара на гэта сродкі мела. Увогуле ж, калі б Францыск не адпавядаў высокім крытэрыям абітурыента, то наўрад ці аказаўся



б у ліку студэнтаў факультэта вольных мастацтваў, дзе грунтоўна вывучалі граматыку, рыторыку, дыялектыку, арыфметыку, геаметрыю, астраномію, музыку…

Першапачатковую адукацыю Ф. Скарына, хутчэй за ўсё, атрымаў дома, у Полацку. А вось далейшыя шляхі-дарогі ў навуку маглі прывесці яго ў Вільню, дзе ў адной са школ, якія існавалі пры парафіяльных касцёлах, ён і прадоўжыў сваё навучанне. Набыўшы там грунтоўныя веды, будучы беларускі першадрукар і асветнік стаў студэнтам прэстыжнай навучальнай установы ў Кракаве і атрымаў пасля яе заканчэння ступені бакалаўра і магістра свабодных навук. Затым, у канцы 1512 года, абараніў у Падуанскім універсітэце званне доктара ў галіне лекарскіх навук.

Дарэчы, пасля атрымання Ф. Скарынам у Падуі вышэйшага вучонага звання звесткі пра яго губляюцца больш як на чатыры гады. Мяркуецца, што адрэзак свайго жыцця паміж 1513–1517 гадамі ён мог правесці ў Вільні, дзе на практыцы выкарыстоўваў атрыманыя веды. Магчыма, у згаданы прамежак часу Ф. Скарына таксама займаўся перакладам Біблії, заводзіў знаёмствы з уплывовымі асобамі, якія затым сталі мецэнатамі яго выдавецкай справы ў Празе. Адным з такіх, як вядома, быў віленскі купец, гарадскі радца і бургамістр Багдан Онкаў…

Не пазней за 1521 год, не здзейсніўшы да канца задумы выдаць у сваім перакладзе ўсе кнігі Біблії, Ф. Скарына пакінуў Прагу і пераехаў у Вільню. Што прымусіла яго рушыць у дарогу? Некаторыя даследчыкі лічаць, што раптоўна спыніць наладжаную ў Празе дзейнасць беларускага асветніка і першадрукара магла прымусіць рэакцыя на яго выдавецкую працу каталіцкага касцёла. Бо акурат на пачатку 1520-х гадоў у Чэхіі пачалося праследаванне рэфармацыйнага руху і ўсіх іншаверцаў. Другой прычынай мог стаць страшэнны паморак з-за эпідэміі чумы, што тады чарговы раз разгулялася ў Празе. Аднак, як бы там ні было, абраць Вільню ў якасці новага месца для жыцця Ф. Скарыну вымусіла цвёрдае жаданне быць бліжэй да свайго народа, для асветы якога ён працаваў. У выніку яго пераезд азнаменаваўся важнай гістарычнай падзеяй: ім была заснавана першая на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, і ўвогуле на ўсіх усходнеславянскіх землях, друкарня.



▲ Касцёл Святой Ганны быў узведзены ў Вільні незадоўга да прыезду туды Ф. Скарыны

Пачаць на новым месцы выдавецкую справу Ф. Скарыну дапамог кіраўнік магістрата Вільні, як яго пазней ахарактарызуе беларускі асветнік у адной са сваіх кніг, «пачцівы муж» і «надстаршы бурмістр слаўнага і вялікага места Віленскага» Якуб Бабіч. Ён перадаў пад друкарню памяшканне, што знаходзілася на вуліцы Вялікай. Даволі хутка на скарынаўскую дзейнасць знайшліся і



грошы. Як лічыцца, усе свае наяўныя сродкі Ф. Скарына ўклаў у справу, частку пазычыў брат Іван. Магчыма, штосьці пад працэнты даў добра яму знаёмы віленскі радца Юрый Адвернік. Карацей, даволі хутка ў Вільні загрукатаў друкарскі станок, і ўжо ў 1522 годзе з'явілася першае ва Усходняй Еўропе выданне – «Малая падарожная кніжка». У склад яе увайшлі: «Псалтыр», «Часасловец», «Акафіст магіле Госпадняй», «Канон магіле Госпадняй», «Акафіст архангелу Міхаілу», «Канон архангелу Міхаілу», «Акафіст Іаану Прадцечы», «Канон Іаану Прадцечы», «Акафіст Багародзіцы», «Канон Багародзіцы», «Акафіст святым Пятру і Паўлу», «Канон святым Пятру і Паўлу», «Акафіст святому Міколу», «Канон святому Міколу», «Акафіст крыжу Госпадняму», «Канон крыжу Госпадняму», «Акафіст Ісусу», «Канон Ісусу», «Шасцідневец», «Канон пакаяльны», «Саборнік», у які ўключаюцца «Святцы» і «Пасхалія», а таксама агульнае пасляслоўе «Писаныи речи в сей Малой подорожной книжце по ряду кратце положены суть». Гэта быў новы ва ўсходнеславянскім кніжным пісьменстве тып зборніка: прадпрымальны Ф. Скарына выбраў для яго невялікі і зручны фармат – 12-ю долю ўмоўнага выдавецкага аркуша. Прызначалася выданне як людзям духоўнага звання, так і свецкім – купцам, службовым асобам, рамеснікам, воінам, якія па характары сваіх заняткаў павінны былі часта вандраваць і ў дарозе атрымліваць канфесіянальную і астранамічную інфармацыю, а пры неабходнасці прыгадаць і словы малітваў. Дарэчы, усе гэтыя 22 часткі «Малой падарожнай кніжкі» некаторыя скарыназнаўцы прапануюць лічыць асобнымі выданнямі.

Для нас сёння, паводле меркавання даследчыкаў жыццяпісу беларускага першадрукара, з усіх частак «Малой падарожнай кніжкі» асаблівую цікавасць і каштоўнасць уяўляюць «Святкі» і «Пасхалія» – царкоўныя календары. Яны, акрамя ўсяго, сведчаць і пра глыбокія веды Ф. Скарыны ў галіне астраноміі. У прыватнасці, там паведамляецца аб працягласці дня і ночы ў розныя даты кожнага месяца, указваюцца летняе і зімовае сонцастаянні, вясновае і асенняе раўнадзенствы, месячныя даты ўваходу Сонца ў сузор'і задыяка і г. д. У гэтых календарах таксама змешчана інфармацыя аб прадказаных ім шасці месячных і адным сонечным зацьменнях, якія і сапраўды назіраліся на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў 1523–1530 гадах. Дарэчы, прыведзеныя Ф. Скарынам звесткі пра зацьменні вельмі дакладныя, больш таго, яны доўгі час, аж да XVIII стагоддзя, заставаліся адзінымі, што выкарыстоўваліся ва ўсіх усходнеславянскіх друкаваных літаратурных помніках. У асобных частках «Малой падарожнай кніжкі» змяшчаліся нават медыцынскія парады. Усё гэта сведчыць, што Скарына адрасаваў сваё выданне найперш вернікам, а не святарам.

На жаль, віленскі перыяд кнігавыдавецкай дзейнасці Ф. Скарыны быў непрацяглым. Пасля «Малой падарожнай кніжкі» ў сталіцы Вялікага Княства Літоўскага выйшла ў 1525 годзе яшчэ адна яго кніга, апошняя – «Апостал». Яна складалася з чатырох самастойных частак: «Дзеянняў апостальскіх», 7 саборных апостальскіх пасланняў, 14 пасланняў апостала Пятра і «Саборніка». Кніга таксама была выдадзена невялікім, зручным для падарожнікаў, фарма-



▼ Вуліца Шкляная, злева – арка ўвахода ў Друкарскі дворык

там і прызначалася для шырокага кола чытачоў. У шматлікіх прадмовах да кнігі, а ўсяго Ф. Скарына напісаў да «Апостала» 22 прадмовы і 17 пасляслоўяў, першадрукар апісвае змест раздзелаў, асобных пасланняў, растлумачвае некаторыя «цёмныя» фразы. Усяму тэксту папярэднічае агульная прадмова Скарыны «Деания светых апостолъ книгъ предмова», у якой усхваляецца хрысціянская вера, звяртаецца ўвага на маральна-этычныя нормы грамадскага жыцця і інш.

Выдадзеныя ў Вільні і «Малая падарожная кніжка», і «Апостал» карысталася попытам. Тым не менш Ф. Скарына спыніў сваю выдавецкую дзейнасць. Чаму? Адназначнага адказу не існуе. Адны даследчыкі лічаць, што на яго рашэнне паўплывалі сямейныя абставіны. Другія тлумачаць сітуацыю яго няўдалай паездкай у Масковію, куды Скарына меркаваў пастаўляць свае выданні, але быў там прыняты недружалюбна: прывезеныя на разгляд яго кнігі спалілі, а ён сам ледзь не загінуў. Трэція сцвярджаюць: завяршэнне кнігавыдавецкай дзейнасці Скарыны звязана з тым, што ў сярэдзіне – другой палове 1520-х гадоў памерлі мецэнаты, якія фінансава падтрымлівалі яго справу. Паводле меркавання чацвёртых, у сярэдзіне 1520-х гадоў свецкае кнігадрукаванне Ф. Скарыны выклікала процідзеянне з боку духавенства як каталіцкага, так і праваслаўнага. Прынамсі, сінод Віленскай епархіі ў 1526 годзе прыняў рашэнне аб узмацненні барацьбы з рэфармацыйнымі павевамі, а каталіцкі епіскапат Вільні адкрыта не адобрыў беспрэцэдэнтную дзейнасць першадрукара, вядомага сваімі сувязямі з гусіцкай Чэхіяй, «лютэранскімі» краінамі, які прызначаў свае кнігі «рускаму» насельніцтву Вялікага Княства Літоўскага. Таму невыпадкова віленскі капітул заказаў для сябе рэлігійныя кнігі не ў скарынаўскай друкарні ў Вільні, а ў кракаўскіх выдавецтвах…

Верагодна, на спыненне Ф. Скарынам выдавецкай справы паўплывалі і ўсе чатыры прычыны адразу. Чаго толькі, скажам, каштавалі яму сямейныя нягоды. Недзе каля 1525 года Ф. Скарына ажаніўся з Маргарытай, удавой аднаго




са сваіх мецэнатаў, віленскага заможнага купца і члена гарадской думы Юрыя Адверніка. Пэўна, іх шлюб мог адбыцца і па каханні, але, па ўсім відаць, не абышлося і без разліку: у Скарыны адразу ж палепшылася матэрыяльнае становішча, разам з жонкай ён стаў падтрымліваць бізнес свайго старэйшага брата Івана, што гандляваў, як і некалі бацька, скурамі і футрам. Як мяркуюць скарыназнаўцы, у гэты перыяд беларускі першадрукар не парушыў сувязі з рознымі палітычнымі, грамадскімі і культурнымі дзеячамі Вялікага Княства Літоўскага. Несумненна, працягваў ён у тыя гады і медыцынскую практыку, бо ва ўсіх афіцыйных дакументах таго часу адзначаецца яго вучоная годнасць «у лекарскіх навуках доктара». Таксама ёсць версія, што менавіта Ф. Скарына быў адным са складальнікаў Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 года.




▲ **Дом № 19а па вуліцы Вялікай, дзе, як мяркуецца, размяшчалася друкарня Ф. Скарыны, і прысвечаная беларускаму першадрукару шыльда на сцяне гэтага будынка**

Тым не менш неўзабаве для Ф. Скарыны настаў перыяд адных няўдач. Асабліва цяжкім выдаўся для яго 1529 год. Летам у Познані памёр яго брат Іван, і Францыск паехаў туды, каб заняцца спадчынай нябожчыка.

У тым жа годзе раптоўна не стала і Маргарыты, на руках у Скарыны засталося двое малалетніх сыноў – Сімяон і Францішак. Да таго ж родзічы нябожчыцы-жонкі падалі на яго ў суд,

патрабуючы падзелу маёмасці. Зразумела, судовая цяганіна пагоршыла яго матэрыяльнае становішча. Не паспелі сціхнуць страсці вакол падзелу спадчыны жонкі, як на Ф. Скарыну навaліліся кампаньёны брата. У лютым 1532 года ён быў арыштаваны і пасаджаны ў турму з-за неабгрунтаванай і нічым не падмацаванай даўгавой прэтэнзіі «іўдзеяў-крэдытораў» Майсея і Лазара з Варшавы і Якаба з Познані. Але сітуацыю ўдалося растлумачыць пляменніку Раману. У судзе пацвердзіў, што як сын свайго бацькі ён прымае на сябе ўсе яго пазыковыя абавязацельствы, пасля чаго Ф. Скарыну выпусцілі з турмы – сам вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт I Стары выдаў прывілей, які гарантаваў яму абарону ад арыштаў, недатыкальнасць маёмасці, вызваленне ад павіннасцей і гарадскіх службаў, незалежнасць ад усіх улад, акрамя каралеўскай.

І ўсё ж Ф. Скарыну не пакідалі думкі пра працяг кнігавыдавецкай справы. Нягледзячы на нядаўнюю смерць жонкі, у пачатку 1530 года па запрашэнні прускага герцага Альбрэхта Гогенцолерна ён едзе ў Кёнігсберг – сённяшні Калінінград. Мяркуючы па перапісцы, чакалі яго там найперш як «доктара лекарскіх навук». У той час у Еўропе лютавала так званая потная гарачка, якая забрала шмат жыццяў і ў Прусіі, таму кампетэнтнаму спецыялісту там былі асабліва рады. Аднак у Кёнігсбергу Ф. Скарына затрымаўся нядоўга: 16 мая 1530 года герцаг Альбрэхт выдае яму прапускную грамату на вяртанне ў Вільню, дзе засталіся сыны «доктара Францыска» і падпісвае пасланне да віленскага ваяводы вялікага канцлера літоўскага Альбрэхта Гаштольда з просьбай аказаць усялякае садзейнічанне «многавучонаму мужу». Але літаральна праз некалькі дзён уладар Прусіі накіраваў у Вільню дэпешу зусім іншага зместу – з патрабаваннем жорстка пакараць Ф. Скарыну. Справа ў тым, што, пакідаючы Кёнігсберг, беларускі асветнік угаварыў паехаць з сабой уласнага лекара герцага і аднаго з найбольш вядомых у горадзе друкароў.

▼ Скульптурная выява «Летапісец» у Друкарскім дворыку



Гэтая рызыкоўная з боку Ф. Скарыны акцыя, як лічаць даследчыкі, была выклікана найперш яго намерам працягваць выдавецкую дзейнасць у Вільні. Магчыма, гэта яму і ўдалося б, але ў тым жа 1530 годзе ў Вільні адбыўся вялікі пажар, у агні якога расплавіўся нават купал гарадской каталіцкай катэдры. Праўда, пры гэтым дом Маргарыты, як і значная частка скарынаўскіх друкарскіх матэрыялаў, засталіся цэлымі. Але, відаць, у планы першадрукара ўмяшалася эпідэмія потнай гарачкі, якая праявілася ў горадзе ў наступным 1531 годзе і даволі хутка распаўсюджвалася. Таму ў той складаны для жыхароў Вільні і яе наваколля час Ф. Скарына быў больш запатрабаваны як доктар. А затым пачалася судовая цяганіна вакол даўгоў брата, і вярнуцца да выдавецкай справы ён так ужо і не змог.

З гістарычных крыніц вядома, што пасля свайго вызвалення з познаньскай турмы Ф. Скарына працаваў сакратаром і асабістым лекарам віленскага біскупа Яна. А ўжо ў сярэдзіне 1530-х гадоў, як мяркуецца, менавіта ў 1535-м, Ф. Скарына вырашыў пакінуць шматпраблемную для яго на той час сталіцу Вялікага Княства Літоўскага і накіраваўся ў Прагу, дзе прыняў запрашэнне чэшскага караля Фердынанда I стаць садоўнікам у толькі што адкрытым батанічным садзе





◀▲ Вуліца імя Ф. Скарыны

каралеўскага замка ў Градчанах. Назад у Вільню ён ужо больш не вярнуўся…

На вуліцах сучаснага Вільнюса знойдзеш няшмат згадак пра жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны. Асноўная, так бы мовіць, памятка пра беларускага першадрукара размешчана ў старой частцы горада, прычым у самым яе сэрцы, на Ратушнай плошчы (па-літоўску – Rotušės aikštė). Лічыцца, што яна ўтварылася ў XV стагоддзі на скрыжаванні гандлёвых шляхоў і на ёй у часы Скарыны функцыянаваў рынак (адсюль і першая яе назва – Рынкавая). Вакол плошчы будаваліся заезныя двары, дамы купцоў і рамеснікаў, а пасля ўзвядзення гарадской ратушы, якая ўпершыню ўпамінаецца ў XVI стагоддзі, плошча стала называцца Ратушнай. Сёння тут сыходзяцца тры вуліцы – Вялікая (Didžioji), Шкляная (Stiklių) і Нямецкая (Vokiečių). Яны, як і Ратушная плошча, – адны з найбольш старадаўніх транспартных артэрый Вільнюса, а гэта значыць, што іх уздоўж і ўпоперак хадзіў не перахадзіў Ф. Скарына. Тым больш што гістарычныя крыніцы захавалі сведчанне аб знаходжанні дома Юрыя Адверніка, куды пасля жаніцьбы з яго ўдавой засяліўся беларускі першадрукар, акурат на Нямецкай вуліцы.

Але мы ў пошуках «скарынаўскага следу» скіруемся на вуліцу Вялікую. Тамтэйшыя двух-, трох- і зрэдку дзе чатырохпавярховікі нічым асаблівым не вылучаюцца з агульнай масы рознастылявых старадаўніх пабудоў Вільні. Як і амаль паўсюдна ў старым горадзе, першыя паверхі дамоў тут аддадзены невялічкім крамам, кавярням ды іншага роду піцейным установам. І вось акурат на сцяне аднаго з тамашніх шынкоў, размешчаных у доме пад нумарам 19а, справа ад ўвахода мы і знаходзім тое, што шукалі, – мемарыяльную шыльду з профілем беларускага першадрукара і надпісам на беларускай і літоўскай мовах: «З 1522 да 1525 году тут, у горадзе Вільні, беларускі асьветнік Францішак Скарына выдаў у Вялікім Княстве Літоўскім першыя друкаваныя кнігі». Хоць бясспрэчныя звесткі і адсутнічаюць, але лічыцца, што якраз гэты дом належаў таму самаму «пачцівaму мужу» і «надстаршаму бурмістру слаўнага і вялікага места Віленскага» Якубу Бабічу, з дазволу і пад апекай якога Ф. Скарына размясціў тут друкарню. Гэтая мемарыяльная шыльда з'явілася толькі ў 1990 годзе – трэба прызнаць, што ў савецкі час літоўцы не вельмі спяшаліся ўвекавечваць імя Скарыны ў сваёй сталіцы і адважыліся на гэта толькі пасля неаднаразовых зваротаў мясцовай беларускай дыяспары.

Дзеля справядлівасці зазначым: паблізу дома Я. Бабіча (трэба завярнуць за вугал і нырнуць у першую ж арку) у так




▲ Імянная шыльда Ф. Скарыны на вуліцы Літаратараў

званым Друкарскім дворыку па Шкляной вуліцы, 4, яшчэ ў 1973 годзе была ўстаноўлена дэкаратыўная гранітная фігура «Летапісец» аўтарства літоўскага скульптара Вацлаваса Круцініса. Даволі часта гэтую скульптуру, якая ўяўляе сабой выяву чалавека, што трымае на каленях разгорнутую кнігу, атаясамліваюць з помнікам Ф. Скарыну. Але гэта зусім не так. Справа ў тым, што ў тым жа доме Я. Бабіча ці ў прылеглым да яго комплексе будынкаў (з-за даўнасці часу дакладна гэта не ўстаноўлена), у 1574 годзе на сродкі купцоў Мамонічаў прадаўжальнік скарынаўскіх традыцый Пётр Мсціславец арганізаваў друкарню, дзе на працягу 50 гадоў выйшла каля сотні выданняў на царкоўнаславянскай, старабеларускай, лацінскай і польскай мовах. Друкаваліся там і біблейскія кнігі, Статут Вялікага Княства Літоўскага, падручнікі і інш. Таму «Летапісец» – гэта зборны вобраз, увасоблены ў граніце ў знакавым для гісторыі кнігадрукавання Вільні месцы. Трэба таксама зазначыць, што віленская беларуская грамада неаднойчы рабіла захады, каб у літоўскай сталіцы з’явіўся адметны помнік нашаму першадрукару і асветніку, але, на жаль, гэтае пытанне застаецца пакуль адкрытым.

Каб пазнаёміцца з яшчэ адной візуальнай памяткай пра Ф. Скарыну, трэба вярнуцца з Друкарскага дворыка на вуліцу Вялікую і пайсці па ёй у адваротны ад віленскай ратушы бок, да зліцця з Замкавай вуліцай (Pilies) – ад яе на першым жа скрыжаванні адыходзіць невялічкая вулачка Літаратараў (Literatų). Яна адметная тым, што, пачынаючы з восені 2008 года, сцены яе дамоў упрыгожваюцца шыльдачкамі, прысвечанымі пісьменнікам, паэтам, перакладчыкам, літаратурным аб’яднанням і нават асобным выданням. Мастакі і скульптары ствараюць свае ўнікальныя прысвячэнні літоўскім і замежным творчым асобам розных эпох. Ёсць там, напрыклад, імянныя шыльды Адаму Міцкевічу, Іосіфу Бродскаму, Восіпу Мандэльштаму, Чэславу Мілашу, Марцінасу Мажвідасу, беларускай паэтэсе Цётцы… Кожная шыльдачка мае свой парадкавы нумар, колькасць якіх увесь час павялічваецца. На час нашага прыезду іх было там 253, а пад 154-м нумарам мы адшукалі памятку, прысвечаную Ф. Скарыну (дарэчы, Цётка – 179-я). Яе аўтара – віленская мастачка Угне Жыліце.

А яшчэ, калі ўзяць сабе за мэту, у Вільнюсе можна адшукаць вуліцу імя Францыска Скарыны, якая размешчана на мяжы старога горада з сучаснай шматпавярховай забудовай. Па сваім працягу яна невялікая – метраў 600, не больш, з акуратнымі адна- і двухпавярховікамі. Раней яна мела назву Добрая. Менавіта такой добрай паўстала вуліца і перад намі, са сваімі спагадлівымі і дабрадушнымі жыхарамі, адзін з якіх, пан Кестуціс, даведаўшыся пра мэту нашага шпацыру ўздоўж яго сядзібы, нават пачаставаў нас крамянымі і вельмі смачнымі яблыкамі з уласнага саду.

Прыемнай памяткай пра Францыска Скарыну можна лічыць і названую яго імем гімназію. Яе гісторыя пачынаецца ў 1994 годзе. У той час у літоўскай сталіцы, на вуліцы Сеціна, 21 (Sietyno), што ў мікрараёне новабудоўляў Каралінешкес, была адкрыта 68-я сярэдняя школа з беларускай мовай навучання. У сакавіку 1997 года рашэннем Віленскага гарадскога савета ёй было прысвоена імя Францыска Скарыны. А ў 2013-м школа набыла статус гімназіі. Сёлета 1 верасня тут пачалі заняткі 203 вучні. Асноўная мова навучання ў віленскай скарынаўскай гімназіі – беларуская, частка прадметаў выкладаецца па-літоўску. Пасля заканчэння сваёй alma mater гімназісты згодна з палажэннямі нацыянальнай праграмы «Беларусы ў свеце» маюць права паступаць на бюджэтнае аддзяленне любой беларускай ВНУ.

Увогуле ж, у гісторыі Вільні-Вільнюса можна адшукаць шмат цікавых старонак, прысвечаных беларускай культурнай спадчыне. Адзіная ўмова для гэтага – жаданне. У нас яно было, і мы, не зважаючы на межы і візы, яго спраўдзілі…

**Сяргей ГАЛОЎКА.**
**Мінск – Вільнюс – Мінск.**
**Фота аўтара**

Беларуская думка